— В этом отношении у нас сделано мало—говорит. Женщины заняты на менее квалифицированной работе. *Но произведенная механизация даст возможность более способных поставить к машине.* Например, Шусьман выдвигается на работу

ольцевой машине, т. Руса- переходит в заготовочное ..лие.

..ичение производительно- ..руда хорошо отразилось и ..териальном положении ра- Сейчас средний заработок ..блей, а раньше был около ..

..зучение производства и ..енное его улучшение,—это ..ая задача дня в нашей ра- Мы так и делаем. Вот недавно сделали переме- отделений фабрики в бо- ..ановом порядке и это зна- ..но улучшило удобства ра- показывает т. Рубенчик.

..щаюсь и ухожу. Спокойно ..езно, как человечьи глаза, ..дят меня окна третьего ..

Виленсталь Нюрин.

..аботница, активно ..аствуй в рацио- ..лизации производ- ..ва. Рационализа- ..я—залог успешного ..роведения семичасо- вого рабочего дня в жизнь!

Вид старого кожзавода, построенного Сальманом.

Слева—способ обработки (мездрения) кожи руками рабочих. Как видно из очерка, этот способ и непродуктивен и слишком тяжелый...



Справа—способ обработки (мездрения) кожи механизированным способом. Здесь основную тяжесть несет на себе машина.



Вид будущего нового кожзавода. Слева оканчивается водонапорная башня. Вправо—вид основного корпуса завода.

ХЛЕБ, ВЫПЕЧЕННЫЙ МАШИНАМИ.

На открытии Минского хлебного завода гостям раздавали свежие ломти только испеченного хлеба.

Хлеб был вкусный, чистый и приятный.

Гости осматривали завод. По высоким железным лестницам они взбирались во все цехи.



Готовится хлебное тесто...

В цехах было чисто, по праздничному убрано; молчаливо стояли в стороне семь холодных печей.

Но гостей поразило не это. Вкусный хлеб будут выпекать только машины. Машины будут просеивать муку, месить тесто, вкатывать тесто в широкие горла печей.

Для человеческих рук остается совсем пустячная работа: затопить печи, проследить за ними, принять готовый хлеб.

Хлеб пекли машины, а они куда чище и понадежней рук пекаря.

Там, где сейчас будут печь хлеб, еще с год тому назад стояли полуразрушенные корпуса. Черными дырами пустых окон были утыканы корпусные стены.

Совсем давно была в этих корпусах шумная фабрика многокрасочных обоев, потом фабрику закрыли. В военные дни не до оклейки стен. Немцы „насильные хозяева" Минска, любители сладенького, вздумали было в этих корпусах открыть мармеладный завод. Но и это предприятие быстро лопнуло. И корпуса осиротели.

По ночам мальчишки лезли сюда вырывать стекла из окон, чтобы на них заработать полтинник для „голубей", в холодную снежную зиму собирались на этот двор старухи с тщетной надеждой отыскать хоть щепочку.

Одиноко стояла высокая труба. И было непонятно, почему над ней не вьется синий дым.

Но вот пришел новый хозяин—Минцерабкооп. Хозяин дельный. И поставил он себе целью покормить Минск новым, вкусным хлебом. Минцерабкооп правильно учел нужды минчан. Долго кормили их хлебом, в котором гвоздик и мышкин хвостик были совсем не диковинкой. Хозяйки не раз жаловались на такие „сюрпризы".

На новом заводе они, конечно, невозможны.

Каждая крупинка муки просеивается здесь в механических ситах. За ее чистоту можно вполне ручаться.

Свыше года залечивали раны старых корпусов бывшей мармеладной фабрики. Двести рабочих ежедневно здесь стучали по жести, месили известь, стройно клали кирпичи. Для хлебного завода построили почти новый большой корпус—4-х этажный, с целыми окнами, с новыми пристройками.

Недаром стоил завод свыше 600 тысяч рублей.

Но много средств обошлась механизация.

В большом, центральном цехе, где свободно мог бы уместиться митинг в несколько тысяч человек, стоят новые печи. Они пока холодны, их только изредка протапливают для просушки. В этих печах ежедневно будут загораться и делаться мягким хлебом правильные куски теста.

На втором этаже этого же цеха стоят бараночные машины. Сотни свежих круглых баранок выбросят они в день.

Потом есть еще машины для выпечки французских булок, пирожных. Завод готов.

Его торжественно открыли.

На днях загорится яркий огонь в семи печах и тогда на полках Минских пекарен вырастут горы свежего хлеба.

Боханки хлеба продвигают в печку...

И снова над высокой трубой „мармеладной" фабрики вьется дым. И нет уже черных дыр в корпусах.

Е. Садовский.

У ВЁСЦЫ „ЗАЦІШША"

Раніца. На вуліцы вёскі Зацішша нешта нязвычайна шумна. Асабліва чуваць галасы баб. Старажыха зацішшанскай школы тлумачыць настаўніку, што гэта ксёндз прыехаў мірыць Адася Ліневіча з жонкай.

— Яна-ж, ведаеце, гэтакая,—пажыве ў мужа з тыдзень, а потым з дому і прападзе, невядома дзе. Доўга шукае жонку Ліневіч, пакуль ня знойдзе яе ў знаёмых за вёрст 20 ад дому, альбо ў радні. Але радня ўжо ня хоча хаваць яе, выганяюць. Вось ня хоча баба з мужыком жыць, хоць ты тут што. А такі-ж ладны чалавек.

А „ладны" чалавек меў вялікую, але бязладную гаспадарку, шмат грошай, невялічкі рост, хіблы, падсьлепаваты твар і 47 год. У хаце яго было цёмна і цесна, ці то ад вузенькіх вакон, ці то ад бруду, ці ўсялякага хламу, што валяўся на бруднай падлозе і лаўках і вісёў на сьценках. Жыла ў іх яго маці—старая, як зямля, але яшчэ даволі бадзёрая. Яна і кіравала і сынам, і гаспадаркаю. Агату, жонку сына, яна кляла страшэннымі словамі, а калі сына ня было ў хаце, кідалася і біць яе. Агата нікому ня жалілася і на вёску не хадзіла.

— Ведама, сорам за сваё распуства,—тлумачылі зацішшанскія бабы.

Праз гадзіну тая самая старажыха прынесла настаўніку пошту ад старасты і расказала, што ксёндз доўга ўгаварваў Агату жыць пабоскаму і ня бегаць ад мужа, бо найцярплівейшы і міласьцівы „пан буг" злуецца на Агату за непаслушэнства і парушэньне сьвятой запаведзі. Агата моцна плакала, але не абяцала ксяндзу жыць „пабоскаму".

— Тут ёсьць адзін хлопец на футары, дык яна, кажуць. .

— А газэты няма,—перабіў гаваркую старажыху настаўнік.

— Няма,—адказала тая і, зразумеўшы, што язык яе залішне заікаўся ў роце, вышла з настаўніцкага пакою.

Праз тыдзень да настаўніка прышла Агата. Яна была маладая, ня больш дваццаці год. Твар яе быў бляды, і толькі чорныя вочы выразна глядзелі з-пад чорных брывей і рабілі твар жывым.

— Калі ласка, мо' вы напішаце ад мяне ліст да мае сястры ў горад,—ціха зьвярнулася яна да настаўніка. І ўсе рухі яе былі ціхія і нясьмелыя.

Покі настаўнік пісаў, яна ўважна глядзела на яго.

— Вось,нікому я гэтак не зайздрошчу, як пісьменнаму чалавеку: вольны ён і ўсюды яму адчынен сьвет,—раптам сказала Агата

— Дык чаму-ж не хадзілі да мяне вучыцца? Вунь, Волька Лявонава і Гэлька Стрыж вучацца, штодня прыходзяць.

— Вы-ж чулі, што кажуць пра мяне людзі,— ціха сказала яна, і твар яе крыху пачырванеў,— нельга мне да вас хадзіць: на вёсцы ганіць мяне пачнуць. Вось каб настаўніца была...

Гэта было вясной. А ў канцы лета з першымі весткамі восені, жоўтымі матылямі-лісточкамі прыляцелі весткі аб вайне і мобілізацыі. І малады заціншанскі настаўнік Раманчык пакінуў школу, і вобразы Заціншша—Ліневіча, Агаты, патанулі ў моры новых размаітых, багатых вобразаў новага, кіпучага жыцьця.

Цяжкай грымучай постацьцю прайшлі гады. 1920 год...

І вось ізноў перад вачыма Раманчыка знаёмая шырокая, пяшчаная дарога, у якую глыбока ўрэзаліся колы. На права сьвятлее невялічкае возера. А над ім, на гары, у зелені саду красуецца белы панскі дом.

— Бальніца,—як-бы паказвае возьнік на маўклівае пытаньне ў вачох Раманчыка. Пад гарой у шырокай нізіне ў беспарадку раскідаліся шэрыя хаткі Заціншша. Далей—сенажаці і палі. А за імі стары, цёмны бор з таемнай думкай пазірае на вёску... Усё тое-ж самае, знаёмае, роднае настаўніку Раманчыку...

— А вы, відаць, не пазналі мяне, тав. Раманчык?—пытае возьнік.

Той з пытаньнем уставіўся ў твар возьніка.

— А я-ж—Барашка—заціншавец. Сыны мае ў вас вучыліся.

— А... помню. Здаровы, здаровы, т. Барашка,— ветліва жме руку возьніка настаўнік.

— Як кажуць, гара з гарой ня сходзіцца...

Тут пайшлі пытаньні, адказы. У памяці і гутарцы двух людзей ажылі старыя дні,—цікавыя моманты і зьявы даўнейшага жыцьця.

—Хто-ж гэта ў вас бальніцу расстараўся адчыніць?

— А бабы, можна сказаць, тав. Раманчык.

— Як гэта бабы, якія бабы?

— Ды так. Нашы бабы—заціншанскія. Як сталі яны зьбірацца на сходах сваіх і сельскіх. Гаманілі, гаманілі. Дэлегатак засылалі на раён. Агата тут наша, дык у вокруг трапіла з нейкімі папарамі. І вось бальніца ёсьць. А, памятаеце, колькі ў нас людзей мерла,—то ад воспы, то ад тыфу. Ды ад усяго. Асабліва дзеці...

— Малайцы бабы вашы.

— Паразумнелі бабы. Курыць некаторыя кінулі. (Цяпер зусім бабы ня кураць у нас). Да гэтай хаты-чытальні прызвычаіліся.



— А навучыліся чытаць?

— Каторыя і добра, асабліва дзяўчаты. Ведаеце, другі раз, як чытане дзяўчына газэтку—ня ведаеш чаму дзівіцца, ці навінам у газэце, ці што дзяўчына гэтак добра чытае. Любата!

Тут Раманчык успомніў пра Агату.

— Вось, вы казалі пра нейкую Агату. Ці ня тая гэта Агата, што ксёндз прыяжджаў мірыць яе з мужам?—запытаў ён у Барашкі.

— Ну, ну, гэта-ж яна, але яна ўжо даўно ня жыве з Ліневічам. Тут у нас на хутары жыў адзін. Паехаў ён на вайну, вось, як і вас тады, прызвалі яго і моцна яго там паранілі, дык вось з ім Агата жыве, і як з яго слабы гаспадар па здароўю, значыцца, дык яна сама кіруе гаспадаркай. І сказаць, хоць невялікая ў іх гаспадарка а добра ідзе. І самі сабой ладна жывуць. А шлюбу ў касьцеле ня бралі. І хлопчыка свайго неяк пановаму назвалі. Вой, як-жа гэтаМ—аркс. Хай, кажуць, будзе ён гэтакі разумны, якім быў той вялікі Маркс. Пановаму сталі жыць людзі, тав. Раманчык.

— Пановаму, — радасна пацьвердзіў настаўнік.

І ўспомнілася настаўніку, як гэты самы Барашка называў яго некалі „панічком", а заціншанскія бабы кідаліся цалаваць яго ў руку, як прыводзілі запісваць у школу дзяцей.

Сьвет дайшоў і да Заціншша—глухога куточка. Шмат працы яшчэ, ой, шмат. Але пачатак добры ёсьць і праца ідзе па належнаму шляху.

І каб Раманчык сустрэў Агату, ёнбы радасна прывітаў яе.

Ю. Т.

Менск.

Сялянкі, ідзеце на перавыбары КСУ.

З 1 сьнежня па 1 студзеня адбудуцца перавыбары сялянскіх таварыстаў узаемадапамогі. Вынікі мінулых перавыбараў сьведчаць аб тым, што ня ўсе сялянкі даведваліся перавыбарчых сходаў. Толькі 20 проц. складалі з агульнага ліку наведваючых сходы.

Часта сялянкі яшчэ дагэтуль лічаць дзеля сябе непатрэбным прыйсьці на сход, бо лічаць, што ня іхняя гэта справа. Правідлова лі гэтая думка? Кожная сьвядомая сялянка павінна ведаць, што камітэты сялянскіх таварыстваў узаемадамогі ёсьць надта важная організацыя для сялян. КСУ аказвае матар'яльную дапамогу сельскай гаспадарцы беднаты, маламоцным, сераднякам; КСУ садзейнічае аб'яднаньню беднаты ў коопэрацыю, атрыманьню льгот, якія дае ўрад у справе крэдыту. КСУ павінен дапамагаць незаможным гаспадаркам сельскагаспадарчымі машынамі і прадпрыемствамі, павінен разгортваць культурную працу сярод сваіх сяброў. Урэшце, КСУ ёсьць такая організацыя, якая навучае працаўнікоў дзеля грамадзянскай працы. КСУ змогуць яшчэ, калі яны будуць моцнымі, дапамагаць абуткам і адзежай дзецям беднаты, каб тыя маглі наведваць школы. Кожная бяднячка ўдава, жонка чырвонаармейца ведае, як важна атрымаць дапамогу насеньнем, інвэнтаром, як важна для яе атрымаць у свой час дапамогу ў уборцы ўраджаю.

Сялянкі павінны павялічыць свой удзел у кіруючым складзе камітэтаў сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі. Лік сялянак у гэтых органах да гэтага часу быў недастатковы: усяго толькі 5 проц., гэта значыць, што з кожных 100 чал., працуючых у КСУ, жанчыны складаюць толькі 5.

На кіруючай працы ў якасьці старшынь сельскіх і раённых камітэтаў сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі працуе малая колькасьць, амаль што адзінкі, але-ж паглядзіш на працу гэтых адзінак, то відаць, што кабеты добра працуюць і што сяляне і сялянкі іх працай здаволены.

Вось, напрыклад, старшыня Траскоўскага сельскага камітэту, Заслаўскага раёну, Менскай акругі; яна ўжо 2 гады на гэтай працы. У час пасяўной кампаніі камітэт пад яе кіраўніцтвам раздае беднякам збожжа для абсемяненьня палёў; добра абстаіць справа з спагнаньнем сяброўскіх узносаў. У камітэце ня было зямельнага вучастку, яна яго дабілася, і ў сучасны момант камітэт мае 4 дзесяціны пахаты, 4 дз. лугу, 2 дз. саду. Гэты камітэт лічыцца адным з лепшых. А вось другі прыклад някепскай працы старшыні Касьцюковіцкага раённага камітэту Магілеўскай акругі. Таксама жанчына, працуе 2 гады і з работай спраўляецца. У гэтым камітэце маецца і цагельны завод, і млын, 16 пракатных пунктаў, каапэравана 294 бядняцкіх гаспадарак. Можна прыкладаў прывесьці шмат.

У заключэньне мы павінны сказаць.

Усе, як адна, на справаздачныя і перавыбарчыя сходы, каб абгаварыць працу камітэтаў, абраць больш працаздольныя склады іх і ўцягнуць больш сялянак-актывістак — батрачак, бядначак, дэлегатак і інш. у іх склад.

Дэлегацкія сходы павінны абгаварыць пытаньне аб перавыбарах КСУ і даць наказ у далейшай працы. Кожная дэлегатка павінна абавязкова сама прысьці на сход і прыцягнуць на гэты сход і другіх сялянак.

Сялянкі-бяднячкі ўсе, як адна, павінны прысьці на сходы беднаты, якія будуць склікацца ячэйкамі КПБ, і абгаварваць пытаньне аб далейшай рабоце КСУ, а таксама высоўваць кандыдатуры ў кіруючы склад камітэту.

Батрачкі, бяднячкі, узмацняйце работу КСУ!

Арапунчык.



Вось навочны малюнак таго, што можа даць селяніну камітэт сяланскай узаемадапамогі (К. С. У.).

11 лют 1983 г. Б-ка

Начало большой работы.

(О матерях-одиночках и беспризорных детях).

Если беспризорный ребенок старшего возраста бросается всем в глаза, умеет сам о себе заявлять, то „маленькие беспризорные“, если их во время не вырвать из рук голодной одиночки-матери и не оказать ей нужной поддержки—„подкидываются“.

За год работы мы имеем большие достижения. Дети преобразились, научились быть чистоплотными, значительно поправились в весе. За этот год не было ни одного смертного случая.

Матери этих детей—одиночки, большинство из них брошенные жены или жены умерших красноармейцев.

При яслях организовалась пошивочная мастерская мешков, где в первую очередь были устроены одиночки с грудными детьми. Дети были помещены в ясли. Заказы в починочную мастерскую получались из военных организаций, ЦРК и других, также открыта была пошивочная мастерская и за это время приобретено 6 швейных машин. Вначале заработок матерей был небольшой. Но, постепенно „квалифицируясь“, они в последние месяцы вырабатывают от 25 до 30 рублей. Там же они получают обеды по себестоимости (10 к.)

Давидович.

г. Минск.

Пошивочная мастерская мешков.

Год тому назад Центральный Совет социальной помощи Охматмлада, борясь с детской беспризорностью и подкидыванием детей маленького возраста, стал на путь открытия яслей для детей одиночек - матерей. За год открыто 3-е яслей на 120 коек. 120 детишек, вырванные из трущоб, голодные, раздетые, болезненные, нашли должный уход, питание, врачебный надзор и воспитание в этих яслях. Первое время приходилось проводить среди них борьбу со вшивостью, откармливать, а в настоящее время проводится в старших группах большая воспитательная работа.

Дети матерей-одиночек в яслях (средняя группа).

Что я успела за год.

(*Минск*).

Год тому назад я впервые была избрана делегаткой. В первое время я даже побаивалась сходить в Женотдел за мандатом. Но постепенно я начала втягиваться в общественную работу. Была избрана кандидаткой Горсовета, где работаю в Секции Охраны Материнства и Младенчества. Приходится часто обследовать разные лечебные учреждения, знакомиться с детскими домами, садами, и т. д. Кроме того, я еще работала в Женском Комитете помощи политзаключенным в Западной Белоруссии и их семьям: я принимала участие в кружечном сборе и организации вечера. Было собрано больше 400 рублей, при том мы, женский Комитет, делали подарки: шили белье и отправляли все это нашим братьям и их семьям, которые томятся в польских тюрьмах.

Делегатское собрание научило многому, о чем раньше понятия не имела. Я начала почитывать в газетах, что делается в буржуазных странах, как живется там нашим братьям—рабочим и работницам и их семьям. На меня большое впечатление произвел наш старый революционер тов. Феликс Кон, который нас на делегатском обще-городском собрании познакомил с борьбой зарубежных братьев. Я еще больше стала следить за газетами.

Кроме того, мне еще много дали экскурсии, проведенные Женотделом. Я побывала на некоторых предприятиях: механической, прачешной учреждениях ВСНХ и т. д.

Я все свое свободное время отдаю на общественную работу. Приходится мне только сожалеть, что жены наших рабочих, выбравши меня, сами отстали и даже собраний женских не посещают. Знания, которые я получила, я постараюсь передать своим товарищам—женщинам.

Д. Сташевская.

Лучший ребенок...

6 ноября в Минске происходил конкурс на здорового ребенка.

Первый приз получила т. Юхнович. Мать-одиночка. Воспитывала ребенка сама, аккуратно посещая консультацию. В премию получила одеяльце для ребенка.

Из 22 детей премировано 17. Не так дороги были одеяльца, кроватки, которые давали в подарок, а дороже всего было *признанное* здоровье любимого ребенка!

Делегатское собрание фабрики „Двина“.

(*Витебский округ*).

Всего делегаток у нас 132 человека. Делегатское собрание работает по сменам по 66 человек в каждой. Работали две секции: профессиональная и хозяйственная. 59 делегаток было прикреплено к практической работе; работали лучше прикрепленные к фабкому и его комиссиям—особенно в производственном совещании.

Делегатки первое время не решались говорить на собрании, но после нескольких занятий они стали задавать вопросы и высказываться; в среднем выступало на каждом собрании 8—10 человек; посещаемость была 70—80 проц.

К концу года выпустили 82 человека; 4 исключено, остальные в течение года отсеялись (механически выбыли, часть по болезни, часть по беременности).

Активность делегаток ярко выразилась во время выборов в Горсовет. *Из 32-х выступавших по наказу—24 делегатки.* Последние своей активностью вовлекли и неорганизованных работниц.

К концу года делегатки выпустили своими силами газету.

За время работы делегатского собрания вступило в партию 8 человек, ликвидировало неграмотность 16 чел. Это они считали достижением делегатского собрания. Многие работницы до делегатского собрания боялись вступать в партию. Теперь они знают, что партия—это их партия, которую они считают своей родной. Делегатки лучше стали относиться к работе, меньше прогулов, меньше порчи товаров, в этом помогло производственное совещание, куда они были прикреплены для практики. Мешало работе отсутствие клуба или какого либо подходящего помещения. Собирались в фабричной столовой, через которую все ходили и которая имеет вид сарая. Шум машин за стеной (досчатой) мешал слушать доклады. Мешали работе две смены да еще разбросанность работниц (за 4—8 верст от фабрики)— спешка к поезду всегда заставляла торопиться на занятия. Слабо была налажена связь с работницами, избравшими делегаток: не было заслушано отчетов на общих собраниях.

Елашева.

Лазьнянскі Райзьезд грамадзкіх працаўніц прайшоў досыць цікава. Выступленьні па дакладах аб дасягненьні па раёну за 10 год мелі бойкі, практычны ўхіл. Гаманілі, што Лазьнянскі млын буйна меле, што мала паліва, што нядосыцьна пранікае ў вёску вэтэрынарыя і аграномія (апошняя не задавальняе неабходнымі зерняачысьціцельнымі машынамі), што ў раёне адсутнічае зубны ўрач і г. д.

В. Жураўлёва.

Могилевский Окружной С'езд работниц и крестьянок прошел необыкновенно активно. По четырем докладам выступало около 80 делегаток.

Среди выступающих особенно выделяется выступление батрачки Косенковой, которая была делегаткой, сейчас избрана членом сельсовета и была выбрана на Всесоюзный С'езд работниц и крестьянок. Она сама посадила огород, всегда советовалась с агрономом. И весь урожай, который дал огород, в сумме 30 рублей пожертвовала в фонд „Наш ответ Чемберлену".

Па Талочынскаму раёну (Аршанская акруга) **дэлегаткі скліканьня 1926-27 году давалі добры прыклад для ўсіх астатніх сялянак.** Так, на васьмі пунктах бязграматных было 67, з іх за гэты час ліквідавалі няграматнасьць 22 дэлегаткі. Зараз няма ніводнае дэлегаткі, якая ня была-б членам коопэрацыі. Усе дэлегаткі зьяўляюцца сябрамі санітарнага гуртка.

Хамякова

Ясли при ф-ке „Двина".

(гор. Витебск).

Ясли организовались в марте месяце 1919 года. Когда открылись ясли было всего двое детей, через месяц стало 6, а в настоящее время ясли работают на две смены с количеством 70 детей. К Октябрю ясли расширили еще на 10 коек.

Уход в яслях за детьми поставлен на должную высоту: детей моют, чисто одевают и кормят под наблюдением врача. Ведется и воспитательная работа с детьми старшего возраста (старших групп).

Окрздравотдел отпускает 4.000 руб. на питание, обмундирование и на хозяйственные расходы по фонду „Г". Отпускается 900 руб. добавочных на питание и хозрасходы.

За всей работой наблюдают дежурные матери, которые дежурят по очереди. Так работают наши ясли.

С. Хобец.

Слева—дети грудники первой смены ф-ки „Двина", а справа—дети старшего в зраста второй смены.

Пра тое, што дорага для работніцы і сялянкі.

(Агляд заметак наконт ясель і пляцовак).

Самая гарачая працоўная пара ў вёсцы—гэта лета і першая палова восені. Касьба, жніво, вырыўка лёну, выбарка бульбы—вось шэраг работ, да якіх вёска дарываецца ўсімі сваімі працоўнымі сіламі, калі на поле выходзяць і мужчыны, і жанчыны, і падлеткі. У вёсцы застаюцца старыя дзяды і малыя пацаны.

Час ідзе. Сонца паліць. Дасьпявае залацістае жыта. Расьце буйна бульба, пышачыся зялёным, як лён, бацьвіньнем. Прырода ня жджэ—трэба пасьпяваць за ёй!

І вось у гэты гарачы працоўны час адным з важных пытаньняў зьяўляецца пытаньне—дзе дзець малых дзяцей, малых дасьціпных жэўжыкаў? Пакінуць дома—нельга: альбо ў студню ці ў рэчку ўвалцца, альбо пакалечыць сябе, альбо яшчэ горш—пажар зробіць. З сабою ўзяць—таксама нельга: толькі адрываюць ад працы, надаядаюць, дый валяюцца-поўзаюць бяз догляду.

Савецкая ўлада прышла на дапамогу вёсцы і асабліва працоўнай жанчыне. Яна пачала адчыняць дзіцячыя ясьлі, пляцоўкі, сады. Маці пакідае дзіцё ў ясьлі ці пасылае на пляцоўку, а сама спакойна ідзе ў поле на працу. Дзеці будуць дагледжаны, накормлены.

Ясьляў і пляцовак спачатку цураліся.

Але далёка ня ўсюды гасьцінна спачатку спатыкалі ясьлі ды пляцоўкі ў вёсцы. Рэч новая, невядомая, баяліся. „Дзяцей у ясьлях б'юць",—распаўсюджвалі чуткі злыя языкі, піша тав. *Жукава* з Полаччыны. „Павялічаць падатак таму, хто будзе аддаваць дзяцей у ясьлі ды пляцоўкі",—пашыралі хлюсьню кулакі, дзяцей якіх у ясьлі і пляцоўкі ня прымаюць. Ды і самі сяляне ня верылі: „дзеці і самі ў пясочак будуць гуляць", „з вясковых дзяцей усё роўна нічога ня будзе",—гаманілі бацькі, піша студэнт Менскага яўрэйскага Пэдтэхнікуму—тав. *Дворкін.*

Але такія выпадкі ёсьць яшчэ і зараз там, дзе ясьлі ўпяршыню, дзе яшчэ не асвоіліся з імі.

Ня лепш абстаяла справа і з пляцоўкамі.

Ясьлі і пляцоўкі, што працавалі, паказалі навочна карысьць свайго існаваньня. Насельніцтва ўбачыла, што дзяцей іх і ня б'юць і падатку не павялічаюць, дый дзеці, пабыўшы ў ясьлях, на пляцоўках, навучыліся таму-сяму добраму, карыснаму. Яны ўжо і дома—ручкі раніцой мыюць, рушнічкі сабе пазаводзілі, просяць, каб ім давалі яду ў асобных місачках, падтрымліваюць у хаце чыстату.

Ясьлі і плацоўкі нам патрэбны.

І варожы настрой пачаў зьмяняцца ўважлівымі, цёплымі адносінамі да ясьляў, да пляцовак як у вёсцы, так і ў горадзе.

„Я зусім цёмная, малаграматная сялянка маю 28 гадоў, толькі сёлета ўбачыла, як Савецкая ўлада дапамагае сялянцы ў яе быту. У нас сёлета былі адкрыты ясьлі, якіх мы не хацелі дапусьціць, каб яны былі ў нашай вёсцы. І я толькі цяпер убачыла, якую вялікую карысьць далі мне ясьлі",—прызнаецца сялянка Віцебскае акругі, Верачэўскага с-савету *Марыля Былаінава.*

Шмат у справе пашырэньня ясьляў і пляцовак зрабілі дэлегаткі.

„Цяжка было ўпэўніць сялянак аддаць сваіх дзяцей. Дзьве дэлегаткі-сялянкі першымі прынеслі сваіх дзяцей у ясьлі; за імі тады пайшлі і іншыя сялянкі",—піша пра вёску Моч *рабкорка Онашка.*

Зараз ужо ёсьць шмат запросін, каб у тэй альбо іншай вёсцы на будучы год адчыніць ясьлі. Разумеецца, гэта вельмі добрае жаданьне. Але *здаволіць яго цалкам за дзяржаўны кошт няма ніякае магчымасьці, і самому несельніцтву ў далейшым трэба будзе праявіць у гэтым напрамку больш самадзейнасьці.* Праўда, сяляне ўжо і сёлета часткова дапамагалі. „Сялянкі прыносілі малако кожны дзень, прыносілі дроў дзеля варкі абедаў, езьдзілі па чарзе за продуктамі ў коопэрацыю",—піша тав. *Лычкоўская.*

Аб гэтым піша яшчэ шмат рабкорак і селькорак. Што за дзяржаўны рахунак усюды, дзе трэба, ясьляў адкрыць немагчыма—гэта ў некаторых мясцох ужо зразумелі. „Сялянкі на сходзе вынесьлі прапанову арганізаваць ясельны фонд, каб у наступным годзе адкрыць ясьлі на свае сродкі",—пішуць *селькоркі, Шостак, Зэлкінд, Юдзянко і Войцік* з вёскі Горна, Менскае акругі. *Гэты голас, гэта пачынаньне трэба падтрымаць і як мага пашырыць.*

Яшчэ адна карысьць.

Але ясьлі і пляцоўкі, апрача непасрэднае карысьці для работніц і сялянак, далі яшчэ агромную карысьць у сэнсе масавае працы. „За паўтара месяцы правялі чатыры сходы бацькоў. Нянька выпісала „Крестьянскую газету", а загадчыца—часопісь. Сабіраліся, разам чыталі. Пасьля некалькіх чытак чуць ня ўсе сялянкі падпісаліся на часопісь. Вынеслі прапанову, каб няграматныя ліквідавалі сваю няграматнасьць",—піша *Л. Ліцьвінава* з Хатоніцкага с-с., Менскае акругі. Дзе існавалі Камітэты Матак, там вось гэтая масавая праца абслугоўваючага пэрсаналу ясьляў і пляцовак яшчэ больш навочная.

Зараз ясьлі і пляцоўкі сваю працу спынілі. Дзеці на зіму зьвярнуліся да хаты. Сялянкі павінны даглядзець за тым, *каб тыя культурныя навыкі, якія дзеці набылі ў ясьлях, і асабліва на пляцоўках, захаваліся і дома.* Шкода будзе, калі дзеці, будучы ў ясьлях і на пляцоўках, былі і чысценькія і адзетыя, а дома яны зноў будуць бегаць цэлы дзень зацухмоліўшыся, вяляцца на падлозе з парасятамі. Сялянкі-маткі павінны гэтага не дапусьціць.

І яшчэ адна заўвага з боку селькорак. „Ясьлі лепш адкрываць пазьней, каб пазьней закрыць, бо з надыходам халадоў селянкам нельга браць дзяцей з сабою на поле",—піша селькорка *Р. П.* з Мазыршчыны. Аб гэтым таксама піша і селькор з Каменскага с-с., Менскае акругі—*Вясковы.*

М. Ройзман.

Служыла Агата ў кулака батрачкаю. Ён прыдабыў ёй дзіцё і зараз адмаўляецца ад гэтага. Але пролетарскі суд знойдзе праўду і кулак будзе плаціць батрачцы алімэнты (даваць грошы на гадаваньне дзіцяці).



СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА.

Дэлегаткі ўзмацняюць сельскую гаспадарку.

(Клічаўскі раён, Бабруйскае акругі).

У час вясеньняй пасяўной кампаніі перад Анталаўскім дэлегацкім пунктам было высунута пытаньне гаспадарчае працы.

Пры абгаварэньні гэтага пытаньня на дэлегацкім сходзе парашылі—усім дэлегаткам пасадзіць турнэпс і кармавыя буракі на сваёй уласнай гаспадарцы. Акрамя таго, парашылі пасадзіць колектыўны агарод. На гэтым-жа сходзе абралі агародную камісію, якая-б увесь час кіравала пасадкай, апрацоўкай агароду.

Па запрашэньню дэлегатак, прыехаў аграном, прывёз насеньня і турнэпс, кармавых буракоў, расказаў, як трэба садзіць і апрацоўваць карняплоды, каб лепшыя вырасьлі. Дэлегаткі ў вызначаны дзень собраліся і зрабілі пасадку агароду.

Дрэнная вясна не давала расьці карняплодам. Зьядалі мошкі ўсходы, але дэлегаткі вялі барацьбу з імі, апырсквалі зеленьню, апрацавалі добра, як казаў ім аграном, і турнэпс пайшоў расьці шпаркім крокам.

Цяпер сапраўды агарод стаў узорным агародам. Сяляне хадзілі, дзівіліся. Казалі, што ніколі ня бачылі такога вялізарнага турнэпсу. Ідзе гутарка па ўсяму раёну пра колектыўны агарод.

Агарод даў каля 60 пудоў карняплодаў, гэта значыць яны забясьпечылі сябе на ўвесь год рознай літаратурай.

Цяпер перад дэлегацкім пунктам паўстае новая задача—організацыя малочнай арцелі.

Купрэева Мар'я.

Як трэба саліць окаркі, сьвініну і сала.

Пры саленьні окаркаў і сьвініны бярэцца на пуд мяса тры фунты высушанай солі, адну чвэртку фунта сялітры, дзьве сталовыя лыжкі дробнага цукру, перцу і лаўровага лісту (касматы). Окарак павінен саліцца 21 дзень, прычым цераз кожныя пяць дзён трэба яго пераварачваць. Больш дробныя часткі высольваюцца ўжо на 14 дзень. Праз два дні пасьля засолу трэба загатаваць кіпятку, узяўшы на 10 бутэлек 1 фунт солі, астудзіць гэты расол і заліць вяндліну так, каб мяса было ў расоле, на мяса-ж трэба палажыць дзеравяны кружок і невялікі камень.

Дзеля солкі сала бярэцца ня тры, а два з паловай фунты солі на пуд. Ні сялітры, ні духоў, ні цукру *не кладзецца*. Кускі перацірaюцца сольлю і кладуцца так: *першы* рад—скурай уніз, другі—скурай уверх. Кладуцца вельмі шчыльна, зьверху засыпаюцца сольлю і прыціскаюцца чым-небудзь. Вады не падліваецца.

Сялітра ў вяндліну кладзецца для таго, каб мяса было прыгожае на выгляд.

Салоная сьвініна, апрача окаркаў, увесь час павінна быць у расоле ў кадушцы, у якой салілася.

Выняўшы окаркі з расолу, іх трэба павесіць на гары, альбо дзе-небудзь у іншым месцы, дзе-б іх ахоплівала паветра з усіх бакоў.

Догляд за хатнім птаствам.

Вельмі сур'ёзнай перашкодай у разьвядзеньні птаства зьяўляюцца агульна-заразныя хваробы, ад якіх штогод здыхае ў нас не адзін дзесятак тысяч птушак. Цэлыя вёскі застаюцца бяз курэй, бяз яек, і ня могуць абзавесьціся птушкамі.

Як пазнаць хворую птутку. У здаровай птушкі пер'е ляжыць гладка, блішчыць, грэбень і барада чырвоныя; птушка пастаянна рухаецца, грабецца ў зямлі, чысьціць пер'е, купаецца ў попеле і пяску, п'е, кудахча.

Выгляд хворай птушкі: яна невясёлая, вочы хмурныя, яна ня кудахча, не грабецца ў зямлі, адстае ад іншых, часамі кульгае, крыльле апушчаны, грэбень і барада блядыя, а часамі нават цямнеюць. Хворая курыца-кураводка кідае куранят.

Што рабіць, калі ў чарадзе ёсьць хворыя птушкі. Калі зьявілася заразная хвароба, трэба зараз-жа хворых птушак вылучыць з ліку здаровых, здохшых закапаць у зямлю, каб ня выкапалі сабакі; заражаныя прадметы выкінуць альбо зусім спаліць; лепш за ўсё не дапускаць хваробы, бо пасьля трудна яе выжываць. У вёсцы дохлую птушку (як і наогул часамі ўсякую здыхліну) выкідаюць за плот альбо аддаюць сабакам, а ў некаторых мясцох проста швыргаюць у рэчку альбо на агарод і гэтым самым толькі спрыяюць пашырэньню хваробы.

О ГРИППЕ

Грипп принадлежит к числу заразных болезней, а потому необходимо знать, как уберечься от него и как бороться с ним.

Грипп вызывается, как и все заразные болезни, особыми мельчайшими живыми существами, которые видны только через сильно-увеличивающий прибор (микроскоп). Называются эти существа—микробами.

Микробы гриппа у заболевшего им гнездятся, главным образом, в носу, глотке и дыхательных путях, вследствие чего и выделяются больным при сморкании, чихании, кашле и выплевывании мокроты.

При разговоре больного со здоровыми людьми мельчайшие брызги зараженной слюны попадают в воздух, оседают на одежде, попадают в рот, вызывают заболевание. Достаточно больному гриппом обтереть рот рукой и подать руку при встрече—здоровому, чтобы последний заразился.

Многие матери имеют скверную привычку вытирать нос у детей своими носовыми платками. Если мать больна гриппом, то неизбежно своим носовым платком перенесет заразу на ребенка. Вытрет здоровый человек лицо тем полотенцем, которым пользовался больной, и неизбежно заразится.

Формы заболевания гриппом

Первая—так называемая *тифозная форма*, при которой больной жалуется на боль во всем теле (ломота, жар, сильная головная боль), обычно при тифозной форме гриппа у больного наблюдается сильный насморк и небольшой кашель. Заболевание при врачебном надзоре и хорошем домашнем уходе проходит через 4—5 дней без последствий.

Вторая—*нервная форма* гриппа, при которой заболевание захватывает человека в течение 8—12 часов, выражается сильной головной болью с потерей сознания, бредом. Эта форма крайне опасна, так как может повести к воспалению мозга, кончающегося смертью.

Третья—так называемая *катарральная форма*, при которой у больного появляется насморк, кашель, головная боль и боль в суставах. Температура обычно очень высокая, а кашель причиняет больному сильное беспокойство, так как вызывается поражением бронхов (воздухоносных трубочек, находящихся к легких).

Четвертая—*ревматическая форма* гриппа, при которой больного особенно беспокоят боли в мышцах, суставах, как при ревматизме.

Пятая—*желудочно-кишечная форма* гриппа, при которой у больного появляется рвота, понос, язык больного сильно обложен белым налетом, температура высокая, аппетита нет; нередки судороги в ногах.

Шестая—*легочная форма* гриппа, при которой поражаются легкие, заболевание в этом случае быстро сваливает человека и выражается высокой температурой, колотьем в боках, сильным мучительным кашлем. Эта форма гриппа вызывает резкое ослабление работы с рдца с тяжелыми сердечными припадками, ведущими, особенно у стариков, к смерти.

Таким образом, главными признаками начала заболевания являются: повышение температуры (жар), головная боль, насморк, кашель и ломота в теле.

Грипп крайне опасен по тем болезням, которые он может вызвать. (Воспаление мозга, легких и т. д.).

Кроме того, перенесенный грипп даже без последующих болезней сильно и на долго ослабляет организм, вследствие чего нередко выздоровевшие от гриппа заражаются туберкулезом. Иногда гриппозные микробы потоком крови из дыхательных путей заносятся в почки и вызывают тяжелое воспаление почек с отеками ног и выделением крови в моче. Особенно тяжело отражается перенесенный грипп на сердце, вызывая длительное ослабление его работы.

Лечение гриппа

Заболевшого гриппом, если только есть возможность, необходимо поместить в отдельную комнату, предварительно чисто вымытую и проветренную (все лишние вещи надо из нее убрать). Лучше всего, конечно, отправить в больницу. Если в помещении имеется всего одна комната, то для больного надо отделить чистый, светлый угол, загородить его повешенной занавеской. Ухаживать за больными должен один из членов семьи, а другие не должны ни заходить к нему, ни присаживаться к нему на кровать.

В помещении больного должно быть тепло, но не жарко. Если имеется малейшая возможность, то надо обязательно проветривать помещение больного.

Около больного надо поставить плевательницу с водой, дать ему отдельно полотенце и платки (чистые тряпочки) для сморкания носа. Воду из плевательницы нельзя выливать где попало, без предварительного обеззараживания. Для обеззараживания можно воспользоваться 5 процентным раствором карболовой кислоты или известковым молоком, приготовляемым из негашеной извести.

Все белье больного, полотенца, наволочки, носовые платки и прочее, прежде чем стирать, надо обязательно хорошенько прокипятить в щелоке. Ухаживающий за больным, входя в его помещение, должен каждый раз или переодевать платье или надевать на себя халат. Кроме того, во избежание заразы, ухаживающий должен одеть на нос и рот маску из марли или тонкой материи.

Ухаживающий за больным не должен забывать, мыть себе руки каждый раз после ухода от больного и при входе к нему. У заболевшего должна быть совершенно отдельная посуда; мыть ее нужно также отдельно от посуды других членов семьи.

Пол не подметайте, когда имеется в квартире больной, а протирайте сырой тряпкой. Не плюйте на пол и не позволяйте этого делать другим. Помните, что потребление водки, самогона и пива во время гриппозной эпидемии, усиливает восприимчивость к гриппу, а потому настойчиво советуйте любителям выпивок воздержаться от употребления спиртных напитков. При встречах со знакомыми не подавайте руки и не целуйтесь.

Д-р Петровская.

О чем писать в следующем номере.

Рабселькорки! пишите в декабрьский номер об участии работниц в рационализации производства, об участии крестьянок в перевыборах КСУ, органов кооперации.

Пишите, как отозвались работницы на массовое вступление рабочих в ряды компартии. Присылайте фотографии работниц, вступивших в партию.

Пишите о работе ликпунктов, о работе работниц и крестьянок в клубах, хатах-читальнях и т. д.

Паштовая скрынка.

Из писем о перевыборах делегаток, районных и окружных с'ездов работниц и крестьянок груду материалов не было возможности использовать по двум основным причинам: 1) многие письма присланы с большим опозданием, 2) многие письма написаны слишком обще, мало фактов. Например: пишут о районном с'езде—было столько-то делегатов, столько-то докладов, ходили туда-то на экскурсию. Или пишут о том, как прошел райс'езд: с'езд прошел активно, деловито и т. п. Но в чем выразилась эта деловитость, что вынесли из экскурсии, какое впечатление, что практического отмечали делегатки в прениях—этого нет в письмах рабселькорок. И это очень печально.

По вопросам о перевыборах делегаток, о райс'ездах, об окружных с'ездах не пойдут материалы следующих товарищей:

Г. Крацер, П. Залткиной, Вясковага, Лены, Біралы, Жу—вой, Палянскай, Р. Шнейдер, Мармондтовой, Т. Левченко, А. Жуковской, Прокофьевой, Ювер.

Невядомаму аўтару — „Дапамажэце жанчынам" друкаваць нельга, бо няма адрасу аўтара. Зьвярнецеся ў Кайкаўскі Райком КП(б)Б.

Алесю Вясёлцы—Поэмку „Гаспадар Васілька"—друкаваць ня будзем, спрабуйце даслаць у „Беларускі Піонэр" (Менск, Комсамольская вуліца, 25).

Аўд. Сьцефаненцы, О. Гайдук,— Вашы заметкі пра ясьлі да друку ня пойдуць.

В. Жураўлёвай—Друкаваць заметку „Няма аховы" ня будзем, позна. Раім падзяліцца сваімі ўражаньнямі з Райжанорганізатарам. Відаць, што ў Вас ёсьць аб чым пісаць. Рэдакцыя чакае новых допісаў. Пішэце частушкі на тэмы быту сялянкі.

М. Марціновіч — „Слухай сялянка"—ня пойдзе. Позна. Пішэце пра сваю работу, як член сельсавету.

Делег. *Ц. Гревнёвой* — ваша статья о делегатских собраниях не пойдет, общие рассуждения. Воспоминания ваши печатаем.

В. Богдановой — стихи „Белоруссии"—не пойдут.

Жанадзелам: Аршанскаму, Полацкаму (раённ.), Гарадоцкаму, Хойніцкаму, Капыльскаму, Лупалаўскаму — дасланыя фатаграфіі райзьездаў друкавацца ня будуць. Друкаваць фатаграфіі груп наогул — няма карысьці. Іншая рэч, калі часамі дасылаюцца колект. фат. групы, занятай на якой-небудзь практычнай працы. Тады мы ў большасьці выпадкаў друкуем.

Верягиной и Трапашко—ответ выслан почтой.

Муравьёву і Хамяковай—ганарар за матар'ял у № 10 часопісі выслалі пераводам.

Шляффер—ваши воспоминания если-бы успели к октябрьскому номеру—возможно были-бы напечатаны. Сейчас поздно. Мы печатаем и в этом номере несколько воспоминаний, но наиболее интересных и ценных.

Тюфеевой—ваши воспоминания печатать не будем. Общие рассуждения о том, что Советская власть хороша. Статью о ячейке МОПР напечатаем в следующем, декабрьском, номере.

З. Н. Ганицкой—поэму „Настенька" получили. Напечатаем в следующем номере (возможно, что с некоторым сокращением).

Хасі Окунь, В. Палянскай і *Н. Русаковай*—вашы вершы да друку не падыходзяць, вельмі-ж слабыя. Вершы ў вас не ўдаюцца, паспрабуйце прозай напісаць. Ва ўсякім разе раім пачытаць кніжку Крайскага „Что надо знать начинающему писателю".

У гэтым нумары:

1. **Артыкулы**: „О чем говорили на 6 С'езде профсоюзов работницы", „Вступаем в четвертый год". „Ліпнёвы пленум ЦК. і ЦКК УсеКП(б)," „О гриппе", „Сялянкі ідзеце на перавыбары К. С. У.

2. **Літаратур. адздел:** „За революцию", „У вёсцы Зацішша", „Наше строительство", „Хлеб, выпеченный машинами", „Другу-санитарке", "Юбилейные частушки".

3. **Корэспондэнцыя:** „Удзел работніц ды сяляняк у барацьбе за саветы", „Никогда не забудем", „Как мы растили партийный актив", „Работа военно-санит. кружка", „Гэта наш адказ", „Вначале было 15 человек, а сейчас—60", „К трехлетию", „Приветствует кружок рабселькорок при Могилевском окрженотделе", „Вітаньне „Беларускай работніцы і сялянцы", „Па часопісі работніцы і сялянкі шмат чаму вучацца". „Привет от английского журнала „Рабочая Женщина", „23 з 13 краін", „Начало большой работы", „Что я успела за год", „Делегатское собрание ф-ки „Двина", „Ясли при ф-ке „Двина", „Пра тое, што так дорага для работніцы і сялянкі", „Дэлегаткі ўзмацняюць сельскую гаспадарку".

4. **Ілюстрацыі**—у нумары 30 малюнкаў і фотографій. На вокладцы: „Работніца і сялянка пішуць у сваю часопісь", на 22 стр. „Справы алімэнтныя".

ЦАНА 15 коп.

ПРИНИМАЕТСЯ ПОДПИСКА

НА ЕЖЕМЕСЯЧНЫЙ ЖУРНАЛ

„БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА“

УСЛОВИЯ ПОДПИСКИ:

На 1 месяц . . 15 к.	На 6 месяцев . 90 к.
„ 3 „ . . 45 к.	„ 1 год 1 р. 80 к.

Подписка принимается: в отделе по работе среди женщин ЦК КП(б)Б (Советская ул., 45), а также и во всех почтово-телеграфных отделениях Белоруссии и агентствах Белгосиздата

О ВЫКРОЙКЕ :: :: ПО ТЕХНИЧЕСКИМ ПРИЧИНАМ ВЫКРОЙКА С ЭТИМ НОМЕРОМ НЕ РАССЫЛАЕТСЯ. ВЫШЛЕМ СО СЛЕДУЮЩИМ, ДЕКАБРЬСКИМ НОМЕРОМ.